WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

10 чэрвеня 2011 г.
ПЯТНІЦА
№ 107 (26971)

Кошт 750 рублёў

## З 9 ЧЭРВЕНЯ РОЗНІЧНЫЯ ЦЭНЫ НА ПАЛІВА Ў БЕЛАРУСІ ЗНІЖАНЫ НА 13-22 ПРАЦЭНТЫ

Кошт дызпаліва зменшаны на 12,7 працэнта (з Br5 100 да Br4 450), бензіну «Нармаль-80» — на 19,2 працэнта (з Br4 950 да Br4 000), АІ-92 — на 17,6 працэнта (з Br5 100 да Br4 200), АІ-95 — на 22,4 працэнта (з Br5 800 да Br4 500).

8 чэрвеня на экстранкай нарадзе па актуальных пытаннях эканомікі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў знізіць цэны на паліва з 9 чэрвеня.

**БЕЛТА.**

## НА ВЫХАДНЫЯ ЦЁПЛЫ ДОЖДЖ, А ПАСВЯЖЭЕ ТОЛЬКІ НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ

Сёння ўдзень фон атмасфернага ціску ў Беларусі панізіцца, таму месцамі чакаецца кароткачасовы дождж і навальніца, паведаміла рэдакцыі **галоўны сіноптык рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА.** Аднак будзе даволі цёпла — 24—30, толькі на паўднёвым захадзе Брэсцкай і паўночным усходзе Віцебскай абласцей 20—23 градусы. Сапраўды цёпла будзе і ў выхадныя. Праўда, у ноч на суботу месцамі, а ўдзень па большай частцы краіны кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ў суботу і нядзелю ўначы 11—18, удзень 22—29 градусаў. Толькі на паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці ўдзень каля 30 цяпла. У пачатку наступнага тыдня стане крыху свяжэй, бо ў панядзелак у многіх раёнах Беларусі, а потым месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. У панядзелак удзень 21—28, у аўторак і сераду — 21—27, а ўначы — 8—15 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ БЕЛАРУСІ РЭКАМЕНДУЕ ЎСТРЫМАЦЦА АД ПАЕЗДАК ДЛЯ АДПАЧЫНКУ НА АЗОЎСКАЕ МОРА

у сувязі з небяспечнай сітуацыяй па халеры ў Данецкай вобласці Украіны, дзе зарэгістравана 14 выпадкаў халеры.

**БЕЛТА.**

## Пайшлі клубніцы: да 18 вёдраў у дзень ад гаспадара!

Смачны фотарэпартаж



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Марыі ЧАРНАВОКАЙ з вёскі Дзятлавічы падчас збору ягад не абысціся без дапамогі нявесткі Алены і ўнука Андрэя.

СТАР. 3

Уладзімір МАКЕЙ:

# «ПАВЫШЭННЕ ЦЭН ЗАКАНАМЕРНА, АДНАК НЕЛЬГА РАБІЦЬ ГЭТА Ў АДЗІН МОМАНТ»

**ТАКОЕ меркаванне выказаў 8 чэрвеня ў гутарцы з журналістам кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей па выніках нарады ў Прэзідэнта па актуальных пытаннях эканомікі, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.**

Кіраўнік Адміністрацыі расказаў, што рэзкае павышэнне цэн на паліва стала асноўным лейтматывам праведзенай нарады ў Прэзідэнта. Па яе выніках Аляксандр Лукашэнка даў даручэнне ўраду знізіць цэны на бензін АІ-95 да Br4500.

«Павысіць цэны можна, і, напэўна, у перспектыве нам давядзецца іх павышаць да ўзроўню суседзяў, таму што ў суседніх краінах цэны на шэраг аналагічных тавараў значна вышэйшыя, чым у Беларусі. Але тыя, хто прымае гэта рашэнне, не маюць рацыі ў тым, што трэба рабіць гэта ў адзін момант», — сказаў Уладзімір Макей.

Як прыклад ён прывёў вынікі маніторынгу апошніх дзён, згодна з якімі на аўтазаправачных станцыях у прыгранічных раёнах Беларусі аб'ём рэалізуемага паліва павялічыўся ў 60 разоў за суткі. «Гэта нават не ў два і не ў тры разы, а ў 60 разоў. Зразумела, што наўрад ці гэта паліва заставалася ў краіне», — адзначыў Уладзімір Макей.

«Просты чалавек не павінен адчуць такога рэзкага росту цэн. Патрэбны час, каб чалавек адаптаваўся да павышэння цэн. Рабіць гэта трэба паступова, паступальна, клапоцячыся паралельна аб сацыяльнай абароне простага чалавека, у першую чаргу аб найменш абароненых слаях», — сказаў ён.

«Але тое, што нам давядзецца ісці на такія крокі, — гэта аб'ектыўна», — рэзюмаваў Уладзімір Макей.

### «Беларусь на працягу месяца атрымае яшчэ $1 млрд з іншай крыніцы»

Уладзімір Макей адзначыў, што практычна ўжо завершана падпісанне адпаведнага пагаднення аб выдзяленні Беларусі крэдыту з Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС. Паводле яго слоў, у бліжэйшы час грошы паступяць у Беларусь.

«Акрамя таго, знойдзены яшчэ адзін мільярд долараў з іншай крыніцы. Грошы таксама паступяць у бліжэйшы час у Беларусь», — сказаў Уладзімір Макей.

Ён падкрэсліў, што ў дзяржавы ёсць дастаткова часу і рэзерваў для таго, каб спакойна пачакаць, назіраць за сітуацыяй і па выніках прымаць адпаведныя меры.

### «У Беларусі не будзе праблем з закупкай тавараў крытычнага імпарту»

Паводле слоў Уладзіміра Макея, валюты ў краіне хапае. Па выніках першых чатырох месяцаў у Беларусь увезена валюты каля $13 млрд. «Гэта нават на $1 млрд больш, чым у самым паспяховым 2008 годзе. Праблема толькі ў тым, што мы вельмі шмат завозім імпарту. Гэта наша галоўная праблема. Нават на $1 млрд больш, чым у мінулым годзе», — сказаў кіраўнік Адміністрацыі.

«Таму трэба ўсім супакоіцца і спакойна працягваць працаваць, а валюта будзе накіроўвацца ў першую чаргу на тыя праекты, якія дадуць максімальна хутчэй аддачу для краіны і ў канчатковым выніку для простага чалавека», — адзначыў Уладзімір Макей, дадаўшы, што менавіта такое даручэнне даў 8 чэрвеня кіраўнік дзяржавы ўраду і Нацыянальнаму банку.

### «Дзяржава будзе прымаць строгія меры да тых, хто спрабуе нажыцца на сітуацыі ў Беларусі»

«Хацеў бы сказаць і пра тых людзей, і пра суб'екты гаспадарання, якія спрабуюць парушыць устаноўленыя ўрадам і Нацыянальным банкам правілы гульні, маецца на ўвазе ў сферы цэнаўтварэння, вывезу тавару за мяжу для нажывы і г.д. Сітуацыя сапраўды складаная, і яна патрабуе строгіх адэкватных мер. І такія строгія адэкватныя меры будуць прымаца адносна парушальнікаў устаноўленых правіл гульні», — сказаў Уладзімір Макей.

Звяртаючыся да насельніцтва, ён адзначыў, што неабходна перацярпець гэты складаны перыяд. «Усім нам, як сказаў Прэзідэнт, трэба зацягнуць паясы, таму што ў гэтай сітуацыі патрэбны некаторы час, каб перацярпець гэтыя эканамічныя цяжкасці. Тое, што здавалася ўчора звычайным, сёння патрабуе ад нас значна большых намаганняў. Мы павінны быць да гэтага гатовы», — сказаў кіраўнік Адміністрацыі.

«Але я абсалютна ўпэўнены ў тым, што мы пройдзем гэту чорную паласу і праз некаторы час адновіцца эканоміка, і жыццё людзей стане лепшым», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

### «Афіцыйны курс беларускага рубля да долара ў бліжэйшы час застанецца ранейшым»

«Курс, які вызначаны ўрадам і Нацбанкам прыкладна Br5 тыс. за долар, у бліжэйшы час не зменіцца, — сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Гэты курс дакладна падлічаны і выверены ўрадам і Нацбанкам».

«Я параіў бы тым, хто сядзіць на мяшках з доларамі і чакае дэвальвацыі, не губляць час і ўключыць гэтыя долары ў эканамічны абарот, інакш у перспектыве можна страціць значна больш», — дадаў Уладзімір Макей.

«Устаноўлены афіцыйны курс выверааны і ў бліжэйшы час не зменіцца», — яшчэ раз падкрэсліў ён.

Паводле слоў кіраўніка Адміністрацыі, на нарадзе выказваліся розныя меркаванні наконт гэтага. Аднак Прэзідэнт адназначна выказаўся ў падтрымку ўстаноўленага афіцыйнага курсу.

«Зразумела, усё можна аддаць на водкуп рыначнай стыхіі. Але дзе гарантыя, што гэта стыхія вывезе карабель? Возьмем, напрыклад, Грэцыю. Такая ж краіна з 10-мільённым насельніцтвам, 100 млрд еўра ўжо ўкладзена ў эканоміку Еўрасаюзам — яны растварыліся, як у пяску, цяпер планецца яшчэ 100 млрд еўра. Вось вам і рыначная эканоміка», — адзначыў Уладзімір Макей.

«Мы за такія грошы пабудавалі б краіну будучага. У нас такіх грошай, на жаль, няма. Таму мы павінны рухацца вельмі асцярожна, узважана, каб не наламаць дроў», — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі.

Абітурыент-2011

## Да паслуг рэпетытараў прыбягалі толькі 16,4 працэнта будучых удзельнікаў ЦТ?

**14 чэрвеня ў краіне стартуе цэнтралізаванае тэсціраванне. У гэтым годзе колькасць яго ўдзельнікаў скарацілася на 23 тысячы чалавек. Як і ў папярэднія гады, назіраць за прыёмнай кампаніяй будзе Дзяржаўная камісія па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзеннем уступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, у якую ўваходзяць чыноўнікі самага высокага рангу: прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, адказныя работнікі Адміністрацыі Прэзідэнта, Савета Міністраў, Камітэта дзяржаўнага кантролю, Нацыянальнага сходу — усяго 52 чалавекі. 70 працэнтаў з іх ужо маюць досвед такой работы.**

— Прызнаемся, што гучалі прапановы скараціць колькасць удзельнікаў камісіі на той падставе, што механізм адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет добра адладжаны і ўжо няма такой вострай патрэбы ў знешнім кантролі. Аднак Прэзідэнт нашай краіны гэтую прапанову не падтрымаў. Ён лічыць, што рана яшчэ расслабляцца, — падкрэсліў у сваім выступленні на першым у гэтым годзе пасяджэнні дзяржаўнай камісіі яе старшыня і старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Анатоль РУБІНАЎ. — Увогуле кіраўнік дзяржавы надае прыёмнай кампаніі вялікую ўвагу, паколькі разумее, што гэта пытанне мае выключнае сацыяльнае значэнне.

СТАР. 3

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк», расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 16 ИЮНЯ 2011 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «АСБ Беларусбанк».
3. О признании утратившим силу решения Общего собрания акционеров ОАО «АСБ Беларусбанк».

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 13 июня), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 16 июня) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

**Дата окончания приема бюллетеней – 13 июня 2011 года.**

**Телефоны для справок: (8 017) 218 84 12, 218 84 73.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

## ЭВАКУІРАВАЛІ 15 СУСЕДЗЯЎ

У Віцебску падчас начнога пажару ў кватэры на чацвёртым паверсе пяціпавярховага дома. А 46-гадовага гаспадара ахоплелай агнём кватэры і яго 40-гадовага госця шпіталізавалі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ISSN 1990 - 763X

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.06.2011 г. (для б/н разлікаў) | | Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ |
|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША 4 961,00 | 1 чэшская крона 300,56 | USD 27,7033 |
| ▼ 1 еўра 7 260,42 | 1 польскі злоты 1835,03 | 10 UAH 34,6942 |
| 1 латвійскі лат 10 232,03 | ▲ 1 расійскі рубель 179,08 | 1000 BYR 55,7747 |
| 1 літоўскі літ 2 101,50 | 1 украінская грыўня 621,10 | EUR 40,5244 |

Аляксандр СУРЫКАЎ:

# «РАСІЯ ВЫСТУПАЕ СУПРАЦЬ УВЯДЗЕННЯ ЯКІХ-НЕБУДЗЬ САНКЦЫЙ АДНОСНА БЕЛАРУСІ З БОКУ ЕС»

**Расія катэгарычна выступае супраць увядзення якіх-небудзь санкцый адносна Беларусі з боку ЕС. Аб гэтым заявіў журналістам Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Паводле яго слоў, у выпадку калі пытанне аб увядзенні санкцый будзе абмяркоўвацца з удзелам Расіі, то Расія будзе выступаць супраць. Любыя санкцыі, эканамічныя або палітычныя, не паляпшаюць жыццё народа, падкрэсліў пасол.

«Інтэграцыя Расіі і Беларусі з'яўляецца найважнейшым доўгатэрміновым вектарам нашых адносін, вакол якога, вядома ж, могуць быць пэўныя ваганні. Галоўнае ў тым, што мы адзіны народ, у нас агульны лёс. І нават калі ў публічнай рыторыцы пачынае іскрыць, Расія і Беларусь з гэтых пазіцый не сыходзяць», — сказаў Аляксандр Сурыкаў.

Паводле яго слоў, непаразуменні ў ходзе інтэграцыйнага будаўніцтва — гэта часовыя з'явы і эмоцыі, а адзінства дзвюх краін — з'ява фундаментальная. Паводле слоў дыпламата, дамінантай у развіцці беларуска-расійскіх адносін цяпер сталі набіраючыя тэмпы інтэграцыйныя працэсы ў рамках Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы, якая фарміруецца.

Аляксандр Сурыкаў канстатаваў, што ў двухбаковым гандлі Беларусь і Расія выйшлі на дакрызісны ўзровень 2008 года: «За студзень—красавік 2011 года тавараабарот склаў ужо амаль $12 млрд, павялічыўшыся на 42 працэнты ў параўнанні з 2010 годам».

«Нас не можа не хваляваць адмоўнае сальда плацежнага балансу Беларусі, якое расце, і тут мы бачым шырокае поле дзейнасці для сумеснага пошуку шляхоў выхаду з існуючай сітуацыі», — падкрэсліў Аляксандр Сурыкаў.

Паводле яго слоў, добрым сігналам развіцця ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з'яўляюцца праекты па стварэнні сумесных вытворчасцяў. Так, толькі ў 2010 годзе на тэрыторыі Расіі было адкрыта больш як 30 вытворчасцяў з удзелам беларускіх прадпрыемстваў. «Пачалася рэальная аддача ад прыходу расійскага капіталу ў беларускую малочную галіну, інтэнсіўна развіваецца банкаўскае супрацоўніцтва», — адзначыў пасол.

Акрамя таго, ён падкрэсліў важнасць развіцця міжрэгіянальных сувязяў паміж Беларуссю і Расіяй.

Паводле слоў пасла, Расія «разумее эканамічную сітуацыю ў Беларусі, якая патрабуе аператыўнай рэакцыі і падтрымкі краін — партнёраў па ЕўрАзЭС». Ён нагадаў, што 4 чэрвеня было адобрана выдзяленне Беларусі крэдыту ў памеры $3 млрд з Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС, асноўным заснавальнікам якога з'яўляецца Расія. Да канца гэтага года Беларусь атрымае $1,24 млрд, у тым ліку першы транш у памеры $800 млн паступіць у чэрвені.

Аляксандр Сурыкаў лічыць важнай умовай стабілізацыі фінансава-эканамічнай сітуацыі ў Беларусі прыток у краіну замежнага капіталу, які, на яго думку, можна прыцягнуць шляхам пачатку працэсу прыватызацыі.

Паводле слоў пасла, планы Расіі па аказанні падтрымкі Беларусі ў будаўніцтве АЭС не змяніліся. Ён праінфармаваў, што ў канцы чэрвеня або ў ліпені плануецца падпісаць дагавор па будаўніцтве АЭС, пасля чаго пачнецца паступленне першых крэдытных траншаў.

Першая атамная электрастанцыя ў Беларусі будзе ўзводзіцца па расійскім праекце АЭС-2006, распрацаваным ААТ «Санкт-Пецярбургскі навукова-даследчы і праектна-канструктарскі інстытут «Атамэнергапраект» (уваходзіць у расійскую дзяржкарпарацыю «Расатам»). Распрацоўка катлавана для будаўніцтва беларускай АЭС на Астравецкай пляцоўцы ў Гродзенскай вобласці пачнецца ўжо ў верасні 2011 года. Цяпер там вядуцца падрыхтоўчыя работы, ідзе будаўніцтва аўтамабільнай дарогі і чыгункі, ствараецца вытворчая база. АЭС будзе складацца з двух энергаблокаў сумарнай магутнасцю да 2,4 тыс. МВт. Генпадрадчык будаўніцтва беларускай АЭС расійскае ЗАТ «Атамбудэкспарт» пацвердзіла гатоўнасць запуску першага энергаблока АЭС у 2017 годзе. Другі блок АЭС плануецца запусціць у 2018 годзе.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў не пацвярджае наяўнасці дамоўленасцяў аб продажы «Беларуськалія», але не выключае магчымую зацікаўленасць расійскіх кампаній.

«Не магу пацвердзіць, што існуюць нейкія дагаворы. Не выключаю, што яны магчымы. Калі Беларусь вырашыць выставіць на продаж нейкі пакет акцый «Беларуськалія», то я не выключаю, што расійскія калійныя кампаніі таксама могуць паўдзельнічаць у таргах», — сказаў Аляксандр Сурыкаў.

Што датычыцца ў цэлым падыходаў Расіі да пытання прыватызацыі беларускіх прадпрыемстваў, Аляксандр Сурыкаў адзначыў, што прыватызацыя з'яўляецца адным з унутраных рэзерваў для стабілізацыі сітуацыі ў эканоміцы без абцяжарвання дзяржбюджэту.

Дыпламат таксама лічыць правільнай палітыку па стрымліванні цэн на ўнутраным рынку Беларусі: «Цэны ў любой эканоміцы, асабліва ў крызісныя перыяды, заўсёды растуць, імкнуцца да сусветных, а роля дзяржавы — у стрымліванні гэтых цэн».

Перагаворы аб продажы Расіі беларускай долі «Белтрансгаза» завершацца ў чэрвені 2011 года. «Перагаворы ідуць, і, я лічу, у чэрвені яны ўсё ж такі завершацца», — сказаў пасол. Паводле яго слоў, прадаўжаюцца і перагаворы наконт падпісання міжурадавага пагаднення аб умовах продажу і далейшага функцыянавання «Белтрансгаза». Як адзначыў Аляксандр Сурыкаў, Расія не сумняваецца ў міжнароднай ацэнцы кошту «Белтрансгаза» і лічыць яе аб'ектыўнай.

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:

## «СТАРТ МЫТНАГА САЮЗА МОЖНА ЛІЧЫЦЬ УДАЧНЫМ»

**Такое меркаванне выказаў учора журналістам старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Андрэйчанка па выніках чарговага пасяджэння Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, перадае БЕЛТА.**

«Да стварэння Мытнага саюза ў 2009 годзе тавараабарот паміж трыма краінамі, якія ўваходзяць у Мытны саюз, складаў $24 млрд. Цяпер гэты тавараабарот ужо $29 млрд. Экспарт Беларусі ў Расію і Казахстан быў каля $7 млрд, цяпер ён каля $10 млрд. Гэтыя лічбы гавораць самі за сябе».

МЗС Беларусі:

## «ЕС прадэманстраваў зняважлівае стаўленне, адмовіўшы ў візах беларускім журналістам»

**Еўрасаюз адкрыта прадэманстраваў зняважлівае стаўленне да сваіх добраахвотна ўзятых міжнародных абавязкаў, адмовіўшы ў выдачы віз беларускім журналістам, якія збіраюцца прыняць удзел у канферэнцыі АБСЕ ў Вільнюсе. Аб гэтым заявіў учора журналістам, адказваючы на пытанне карэспандэнта БЕЛТА, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Савіных.**

Як адзначыў Андрэй Савіных, канферэнцыя ў Вільнюсе пазіцыянавалася як важнае мерапрыемства для ўмацавання свабоды СМІ, свабоды выказвання меркаванняў, забеспячэння правоў і бяспекі журналістаў. Запрашэнне для ўдзелу ў гэтым мерапрыемстве было падпісана дзеючым старшынёй АБСЕ, міністрам замежных спраў Літвы Аўдронюсам Ажубалісам і прадстаўніком АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ Дуняй Міятавіч.

Паводле яго слоў, дзіўную няўпэўненасць таксама дэманструе прадстаўнік АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ Дуня Міятавіч, якая спрабуе па розных падставах адысці ад існуючай сітуацыі. На думку прэс-сакратара МЗС Беларусі, гэта пацвярджае яе палітычную ангажаванасць і поўнасцю дыскрэдытуе яе ролю незалежнага арбітра, на якую яна прэтэндуе...

### Абзац

◢ У Мінску на 1000 мужчын прыходзіцца 1184 жанчыны.

◢ **У сувязі з гарачынёй Мінскі холадакамбінат №2 павялічыў пастаўку марозіва ў гандлёвую сетку амаль удвая — да 55 т гэтага ласунку ў дзень.**

◢ Падчас купання ў канале Сляпянскай воднай сістэмы паблізу вуліцы Пляханава ў Мінску патанула жанчына. Яе цела знайшоў мінак каля 15 гадзін. Згодна з папярэднімі звесткамі, прычынай смерці мінчанкі 1971 г.н. стала рэзкае пераахаладжэнне арганізма пры купанні. На беразе гаспадыню застаўся чакаць верны сабачка... З пачатку лета ў Мінску зафіксавана ўжо 9 выпадкаў смерці людзей на вадзе.

◢ **Праваахоўнікі выявілі плантацыю маку ў 6 га паблізу вёскі Хойна Пінскага раёна. Усе расліны знішчылі.**

### Поўны абзац

◢ Кур'ёзны выпадак здарыўся ў Гродзенскім раёне. Раніцай 7 чэрвеня кіроўца аўтамабіля «Фальксваген-Кэдзі» ехаў па вёсцы Путрышкі ў бок Гродна. Наблізіўшыся да «Рэно», які рухаўся ў спадарожным кірунку з хуткасцю 15-20 кіламетраў у гадзіну і ўключанай аварыйнай сігналізацыяй, вырашыў абагнаць яго. Выехаў на паласу сустрэчнага руху і ўбачыў чатырох гусей. Тры птушкі ўратаваліся, а адна загінула пад коламі. Кіроўца «Фальксвагена» паехаў далей. У гэты момант да свайго падворка пад'язджаў гаспадар птушак. Убачыўшы, што здарылася, кінуўся ў пагоню на сваім аўто «Фальксваген-Гольф». Праз некалькі сотняў метраў дагнаў «Фальксваген-Кэдзі», сказаў яго кіроўцу, што з'яўляецца гаспадаром забітай птушкі. Прапанаваў аплаціць шкоду, аднак пачуў у адказ адмову. Тады гаспадар гусака выклікаў ДАІ. Выпадак быў аформлены як ДТЗ. Вінікі будуць вядомыя пазней.



*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ФАБРИКА «БЕРЕЗКА»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**ПО ПРОДАЖЕ КАПИТАЛЬНОГО СТРОЕНИЯ СКЛАДА (инв. № 630/С-65854), общей площадью 363,2 кв. м, расположенного по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Виленская, д. 12, корп. 1.**

**Начальная цена с НДС — 290 000 000 бел. руб.**

**Площадь земельного участка 0,0409 га.**

Задаток в сумме 29 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с 3012192090011 отделение 932 ОАО «Белинвестбанк» г. Молодечно, код 739, пр. Партизанский, 1, ОАО «Фабрика «Березка». УНП 600136873.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **12.07.2011 г. в 12.00** по адресу: г. Молодечно, ул. Виленская, д. 12, кабинет директора. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.07.2011 г. включительно до 17.00** по вышеуказанному адресу.

**Тел./факс: (80176) 77 14 70.**

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСА

**ГОСУДАРСТВЕННЫЙ КОМИТЕТ ПО ИМУЩЕСТВУ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСА ПО ПРОДАЖЕ ПРИНАДЛЕЖАЩИХ РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ АКЦИЙ ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «БАРАНОВИЧСКАЯ ШВЕЙНАЯ ФАБРИКА».**

Конкурс состоится **15 июля 2011 г.** по адресу: г. Минск, переулок Краснозвездный, 12.

Организатор конкурса – Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12.

| № | Полное и сокращенное наименование, место нахождения акционерного общества | Размер уставного фонда, штук акций | Номинальная стоимость акции, рублей | Доля государства в уставном фонде | | Количество продаваемых акций | | Начальная цена продажи акций, рублей | Условия конкурса |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | штук акций | в % к УФ | штук акций | в % к УФ | | |
| 1 | Открытое акционерное общество «Барановичская швейная фабрика» (ОАО «БШФ») 225409, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Войкова, 2 | 1631046 | 4400 | 1628876 | 99,9 | 424072 | 26 | 2287688216 | Внесение победителем конкурса в течение двух лет со дня заключения договора купли-продажи акций в уставный фонд ОАО «Барановичская швейная фабрика» неденежного вклада в виде нового технологического оборудования на сумму не менее 3,4 млрд. рублей; сохранение в течение пяти лет со дня заключения договора купли-продажи акций профиля деятельности общества и его специализации по производству детской одежды. |

Время проведения конкурса по продаже принадлежащих Республике Беларусь акций ОАО «БШФ» – 10.00.

Для участия в конкурсе по продаже акций ОАО «БШФ» в срок **до 16.00 29 июня 2011 г.** по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, каб. 401 представляются следующие документы:

заявление на участие в конкурсе по форме, утвержденной Государственным комитетом по имуществу;

юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором конкурса, доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет неруководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор);

юридическими лицами, иными организациями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

индивидуальными предпринимателями – резидентами Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором конкурса;

индивидуальными предпринимателями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителями граждан Республики Беларусь, индивидуальных предпринимателей – резидентов Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителями иностранных физических лиц, индивидуальных предпринимателей – нерезидентов Республики Беларусь – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в конкурсе физические лица, индивидуальные предприниматели, представители физических лиц, индивидуальных предпринимателей, юридических лиц, иных организаций предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором конкурса.

**Дополнительно представляется документ, подтверждающий согласие антимонопольного органа на совершение сделки.**

Задаток для участия в конкурсе по продаже акций ОАО «БШФ» уплачивается в размере 228 768 820 рублей в срок до **13 июля 2011 г.** согласно договору о задатке, заключаемому с Фондом государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь: в бел. рублях на счет № 3642974000028; в EURO на счет № 3642974005036; в USD на счет № 3642974005052; в рос. рублях на счет № 3642974008046 в филиале № 529 «Белсвязь» ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 720; получатель платежа – Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, УНП 102314789.

Участник конкурса, выигравший конкурс, обязан возместить затраты на организацию и проведение конкурса по продаже акций ОАО «БШФ» в течение 3 рабочих дней с даты его проведения.

Договор купли-продажи акций по результатам конкурса заключается в течение 20 календарных дней с даты его проведения.

Дополнительная информация об объявленных конкурсах размещена на официальном сайте Государственного комитета по имуществу www.gki.gov.by в разделе «Продажа акций» в подразделе «Аукционы-конкурсы».

**Контактный телефон Фонда государственного имущества: (017) 284 85 62.**

# ЗАБУДОЎШЧЫКІ ПРОСЯЦЬ... ПАРАДЫ

**УЧОРА ў Камітэце дзяржаўнага кантролю адбылася «прамая лінія» на тэму будаўніцтва жылля ў Мінску. На працягу трох гадзін начальнік галоўнага ўпраўлення кантролю па г. Мінску КДК РБ Іван РАМАНОВІЧ адказаў на 33 званкі, усяго ў Камітэт звярнуліся 73 чалавекі.**

Больш за ўсё пытанняў было ад забудоўшчыкаў, якія заключылі дагаворы долевага будаўніцтва кватэры, дзе кошт квадратнага метра прывязаны да доларавага эквіваленту. Гэтыя людзі апынуліся ў вельмі складаных умовах. Кошт будаўніцтва іх жылля амаль не змяніўся, але пасля дэвальвацыі нацыянальнай валюты высветлілася, што льготнага крэдыту, які яны атрымалі ў беларускіх рублях, цяпер у значнай ступені не хапае, а грошы плаціць трэба і ўзяць іх няма дзе.

— Гатоўнасць нашага дома складае 38 працэнтаў, — дзяліўся сваёй сітуацыяй Андрэй Рудаў, дольшчык жылога комплексу «Дружны». — Калі лічыць курс да дэвальвацыі, то дзве трэці кошту кватэры мной аплачана. Але цяпер аказалася, што гэта — значна меншая частка, і сёння я павінен знайсці суму, якой у мяне няма. Што рабіць?

— Мая сям'я з 4 чалавек, — расказала Таццяна Каралёва. — Наш дагавор з таварыствам «Арэса Сэрвіс» прадугледжвае кошт будаўніцтва жылля ў доларавым эквіваленце, але банк нас крэдытуе ў беларускіх рублях. Цяпер, калі крэдыт банка пакрывае значна меншую частку кошту кватэры, мы не ў стане працягваць будаўніцтва...

— Калі мы бралі льготны крэдыт, то ён быў роўны 70 тысячам долараў, — тлумачыла Вольга Мікалаеўна. — Пасля 23 мая ён стаў роўны 30 тысячам долараў, а да канца года мы павінны разлічыцца за будаўніцтва. Ці могуць нам павялічыць крэдытную лінію?

— Я стаю на ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, — паведаміла Кацярына Аляксандраўна. — Наш дом будуецца па адрасе праспект Дзяржынскага, 16, ён мае 32 працэнты гатоўнасці. Сёння мне патрэбна дадаткова знайсці 228 млн беларускіх рублёў, бо дагавор прывязаны да доларавага эквіваленту, але банк дакрэдытоўваць адмаўляецца...

— Дом гатовы ўжо амаль на 60 працэнтаў, тэрмін здачы — трэці квартал, але сёння кошт квадратнага метра падскочыў на 2 млн і мы ў разгубленасці, — скардзілася Вольга Аляксандраўна.

— Я 22 гады прастаяла ў чарзе на кватэру, мы жывём у інтэрнаце, і гэта — адзіны мой шанц пабудаваць уласнае жыллё, — дзялілася член ЖБК Галіна Сяргееўна. — Арыенціровачны кошт квадратнага метра у нашым дагаворы складаў 2 600 тысяч беларускіх рублёў. Калі кошт значна вырасце, мы будаўніцтва не пацягнем, бо мой аклад аператара сувязі сёння — 500 тысяч рублёў...

З падобнай праблемай дазваніліся яшчэ некалькі чалавек. Іх звароты не былі падобныя на скаргі, хутчэй — на просьбы аб дапамозе і парадзе. Людзі дзяліліся сваёй бядой, бо разумелі, што падпісваць дагавор, у якім кошт квадратнага метра прывязаны да долара, іх ніхто не прымушаў. Больш за тое, такі пункт дагавора ідзе ў разрэз з заканадаўствам, бо ўсе разлікі ў нашай краіне да нядаўняга часу вяліся толькі ў нацыянальнай валюце.

— На сайце Мінгарвыканкама «вісіць» тыпавы дагавор, які можа служыць узорам для заключэння падобнага роду здзелак, — заўважыў **старшыня Камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Аляксандр ДАМЕНІКАН**, які браў удзел у «Прамой лініі». — Любое адхіленне ад гэтага ўзору павінна насцярожыць патэнцыйнага забудоўшчыка і падштурхнуць да дадатковых кансультацый. Дагавор, у якім кошт квадратнага метра прывязаны да доларавага эквіваленту, супярэчыць Указу № 396. Што можна зрабіць цяпер? Можна выйсці з арганізацыі забудоўшчыкаў і вярнуць свае грошы. Альбо запатрабаваць ад забудоўшчыка эканамічнага абгрунтавання павышэння кошту будаўніцтва. Ва ўсякім выпадку, пасля завяршэння будаўніцтва павінен быць праведзены пераразлік па фактычным кошце выдаткаў, і кошт яго для «чарговікоў» не павінен перавышаць гэтай сумы плюс 5 працэнтаў рэнтабельнасці. У выніку кошт жылля сёння атрымліваецца меншы за памер дэвальвацыі. Так, цэны будуць іншыя, цэмент падаражэў на 26 працэнтаў, і, напэўна, будзе яшчэ даражэць. Выраслі транспартныя выдаткі, электраэнергія. Ранейшымі пакуль застаюцца толькі заробкі, але і гэта выклікае свае праблемы, бо будаўнікі цэлымі брыгадамі сёння з'язджаюць на заробкі ў Расію і іншыя краіны. І тым не менш сёння кошт квадратнага метра будаўніцтва, якое пачынаецца, роўны 5200 тысячам рублёў у каркасным доме і каля 4 млн — у панэльным. Мы, у сваю чаргу, правядзём работу з тымі арганізацыямі, якія заключылі дагаворы ў доларавым эквіваленце і сёння неапраўдана павышаюць кошт будаўніцтва. Магчыма, некаторую напружанасць у гэтым пытанні ўдасца зняць.

Іншыя пытанні і адказы «прамой лініі» чытайце ў наступным нумары.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# Да паслуг рэпетытараў прыбягалі толькі 16,4 працэнта будучых удзельнікаў ЦТ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Традыцыйна асноўная нагрузка ў ажыццяўленні кантролю за ходам правядзення ўступных іспытаў ускладзена на работнікаў Камітэта дзяржаўнага кантролю: да гэтай работы будуць прыцягнуты па краіне 264 работнікі КГК, у тым ліку 40 чалавек з цэнтральнага апарату. Акрамя таго, арганізацыю і каардынацыю ўсёй работы будзе забяспечваць міжведамасная рабочая група дзяржаўнай камісіі, створаная на базе Камітэта дзяржаўнага кантролю, у склад якой увайшлі прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Камітэта дзяржаўнага кантролю, Міністэрства адукацыі, Міністэрства ўнутраных спраў, а таксама абласных камісій, якія ўзначальваць старшыні абласных камітэтаў дзяржаўнага кантролю. Члены камісій будуць адсочваць парадак дастаўкі, захоўвання, забеспячэння сакрэтнасці і адпраўкі матэрыялаў ЦТ, рэжым пропуску і ідэнтыфікацыі асоб удзельнікаў тэсціравання, умовы работы з тэстамі ў аўдыторыях і іншыя ключавыя моманты.

Між іншым, у 2010 годзе ўпершыню не было выяўлена крымінальных спраў, звязаных з уступнай кампаніяй. Было ўстаноўлена толькі 13 выпадкаў дробных парушэнняў у шэрагу ВНУ і ССНУ, вінаватыя ў якіх (18 чалавек) былі прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці.

**Дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ** паведаміў членам дзяржаўнай камісіі, што сёлета з 75 тысяч выпускнікоў агульнаадукацыйных школ для ўдзелу ў ЦТ зарэгістраваліся 86,7 працэнта ад іх агульнай колькасці — крыху менш, чым у папярэдні гады. А ў агульнай колькасці ўдзельнікаў ЦТ доля выпускнікоў школ бягучага года складае 67,8 працэнта. 23,9 працэнта ад агульнай колькасці ўдзельнікаў ЦТ — выпускнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, а выпускнікі прафтэхустаноў складаюць усяго 0,5 працэнта. Як вядома, пры рэгістрацыі на ЦТ у абітурыентаў цікавяцца, як тыя рыхтаваліся да ўступных іспытаў. І калі даверваць агучанай інфармацыі (а з іншага боку, не даверваць ёй падстаў няма), то паслугамі рэпетытараў карысталіся толькі 16,4 працэнта будучых удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання, на падрыхтоўчых курсах пры навучальных установах займаліся 17,4 працэнта абітурыентаў і 6,9 працэнта выкарыстоўвалі для падрыхтоўкі да паступлення школьныя факультатывы. «Мяркуем, што роля рэпетытарства пры падрыхтоўцы абітурыентаў да ЦТ некалькі перавышаецца», — адзначыў Мікалай Фяськоў.

**Міністр адукацыі нашай краіны Сяргей МАСКЕВІЧ** паведаміў, што пры арганізацыі ўступнай кампаніі 2011 года былі ўлічаны і рэалізаваны многія прапановы дзяржаўнай камісіі, якія яна робіць штогод па выніках аналізу прыёмнай кампаніі і прадстаўляе свае прапановы на разгляд кіраўніку дзяржавы. Так, быў праведзены аналіз тэставых заданняў 2010 года і зацверджана новая спецыфікацыя тэстаў, быў пераглядзены банк тэставых заданняў па беларускай мове, каб выключыць з яго на час пераходнага перыяду па ўкараненні новых правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі заданняў з улікам новых арфаграфічных нормаў. Былі прыняты меры па ўдасканаленні якаснага складу распрацоўшчыкаў і экспертаў тэставых заданняў, павялічылася колькасць кандыдатаў навук і настаўнікаў вышэйшай катэгорыі, праведзена іх ратацыя... Сяргей Маскевіч адзначыў, што паўсюднае ўкараненне ў гэтым годзе аўтаматызаванай сістэмы (ва ўсіх пунктах рэгістрацыі на ЦТ) вывела працэс рэгістрацыі на новы ўзровень надзейнасці і аператыўнасці.

Анатоль Рубінаў расказаў, што ўжо ў будучым годзе мяркуецца мадэрнізаваць аўтаматызаваную сістэму «Агульнарэспубліканскі банк звестак удзельнікаў ЦТ» да ўзроўню аўтаматызаванага залічэння ў ВНУ. Праўда, дзейнічаць для падстрахоўкі будуць на этапе апрабацыі паралельна і старая, і новая сістэма залічэння, каб выключыць магчымыя збоі і любыя памылкі, якія могуць вельмі дорага каштаваць тым, хто застанецца за бортам.

Па даручэнні дзяржкамісіі Міністэрствам адукацыі была створана міжведамасная камісія па вывучэнні льгот пры паступленні ў ВНУ і ССНУ, у склад якой увайшлі прадстаўнікі міністэрстваў, што маюць у сваім падпарадкаванні навучальныя ўстановы. Камісія свае прапановы па ўпарадкаванні льгот ужо накіравала ў Савет Міністраў і Адміністрацыю Прэзідэнта. А без упарадкавання льгот сістэма аўтаматычнага залічэння наўрад ці запрацуе.

— Спадзяёмся, што калі абітурыенту адразу будзе прапанавана вызначыцца з прыярытэтнымі спецыяльнасцямі, на якіх той пажадаў бы навучацца, то гэта паспрыяе больш свядомаму прафесійнаму выбару маладых людзей. А што мы назіраем сёння? Спачатку абітурыент здае тры тэсты, а затым шукае, куды ён можа са сваімі баламі прайсці. А будзе ўсё наадварот: спачатку, калі ласка, вызначайся са спецыяльнасцямі і навучальнымі ўстановамі, а затым ідзі здаваць тэсты, — падкрэсліў Анатоль Рубінаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Распачалася нарыхтоўка

**Прадпрыемствы спажывецкай кааперацыі закупляюць салодкую ягаду ў асноўным у насельніцтва Лунінецкага, Іванаўскага і Маларыцкага раёнаў. Зараз закупачная цана на клубніцы складае ад 6 да 8 тысяч рублёў за кілаграм, паведамілі ў Белкаапсаюзе.**

Спачатку складваліся неблагія віды на ўраджай: нарыхтоўчыя арганізацыі планавалі закупіць не менш за 3 тысячы тон клубніц. Аднак... Як канстатуюць у Белкаапсаюзе, сухмень, што працягваецца даволі доўгі час на поўдні краіны, можа адбіцца на ўраджайнасці ягады, бо клубніцы патрабуюць не толькі сонца, але і шчодрага паліву... Па прагнозах спецыялістаў, закупачныя цэны на клубніцы ў далейшым будуць залежыць ад умоў надвор'я і кан'юнктуры рынку, што будзе складвацца надалей. Сёння ягада, нарыхтаваная прадпрыемствамі спажывецкай кааперацыі, прадаецца, напрыклад, на рынках сталіцы па цане ад 12 да 15 тысяч рублёў за кілаграм.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**





# Пайшлі клубніцы



Клубніцы едуць у вёску Дварэц на ўсіх відах транспарту.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Першыя ягады мы гэтак рана не чакалі, — кажуць жыхары вёскі Дзятлавічы Лунінецкага раёна. — Звычайна сезон пачынаецца ў нас пасля дзясятага чэрвеня.

Насталі неспакойныя дні для вёсак, якія знаходзяцца побач з беларускай клубніцавай сталіцай — вёскай Дварэц. Сабраную спелую ягаду звозяць сюды, каб хутчэй збыць перакупшчыкам з Беларусі і Расіі. Вязуць з Цны, Дрэбску, Бродніцы, Любачына, Лахвы і нават Лунінца. Учора кошт ягады вагаўся паміж 5-6 тысячамі рублёў за кіло. Хто мае час і прагне больш зарабіць, вязе свой тавар, які, дарэчы, хутка псуецца, на дарогу і просіць за вядро 60-70 тысяч.



У Дзятлавічах не знойдзеш такога падворка, каб у ёй не было адведзена хоць пару сотак пад самую смачную і сакавітую ягаду. Звычайна 10, а нярэдка і па 30-40 сотак. Каб мець неблагі даход (для многіх ён асноўны) на ўвесь год, жыхарам даводзіцца ўставаць а чацвёртай гадзіне раніцы, збіраць па пяць-сем вёдраў і рабіць некалькі рэйсаў у вёску Дварэц за шэсць, дзесяць, і нават пятнаццаць кіламетраў. Самыя моцныя гаспадары клубніцавых плантацый здаюць у дзень да 18 вёдраў. Добра тым, хто жыве непасрэдна ў вёсцы Дварэц — побач з найвялікшым клубніцавым кірмашом на прасторах ад Масквы да Брэста. Але сезон надзвычай скарачэнны — глядзіш, час першай ягады хутка міне.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*Лунінецкі раён.*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### НІДЭРЛАНДЫ ЗАБЛАКАВАЛІ ЎСТУПЛЕННЕ БАЛГАРЫІ І РУМЫНІІ Ў ШЭНГЕН

**Урад Нідэрландаў заявіў, што разглядзіць пытанне далучэння Балгарыі і Румыніі да Шэнгенскай зоны толькі ў 2012 годзе пры ўмове паспяховых прававых рэформаў у гэтых дзяржавах, паведамляе Франс Прэс са спасылкай на нідэрландскага міністра па справах іміграцыі Герда Лэерса.**

«Прымаць рашэнне яшчэ рана, і нам, без сумневу, запатрабуецца для яго больш часу», — заявіў у чацвер Лэерс пасля таго, як напярэдадні Еўрапарламент прагаласаваў за ўступленне Балгарыі і Румыніі ў Шэнген без далейшых адкладаў. Аднак для далучэння да Шэнгенскай зоны новага партнёра патрабуецца аднадушная згода ўсіх 26 дзяржаў, якія ў яе ўваходзяць.

«Мы патрабуем ад новых краін эфектыўна кантраляваць нашы агульныя межы. Акрамя таго, неабходна, каб прававыя рэформы ў Балгарыі і Румыніі прайшлі паспяхова і сталі незваротнымі», — адзначыў нідэрландскі міністр.

### ЭКАНОМІКА ЛІТВЫ РАСЦЕ БОЛЬШ ІМКЛІВА, ЧЫМ У ІНШЫХ КРАІНАХ ЕС

**Літва, паводле звестак еўрапейскага статыстычнага агенцтва «Еўрастат», у першым квартале 2011 года стала лідарам Еўрасаюза па росце ВУП.**

Рост эканомікі Літвы ў першым квартале гэтага года ў параўнанні з чацвёртым кварталам 2010 года аказаўся самым імклівым у Еўрасаюзе і склаў 3,5%, у той час як агульны рост ВУП усіх краін ЕС склаў усяго 0,8%. Следам за Літвой ідзе Эстонія — 2,9%.

Рост ВУП Літвы ў студзені-сакавіку ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года быў адным з самых вялікіх у Еўрасаюзе і склаў 6,8%. Апярэдзіла Літву толькі Эстонія (8%). Трэцяе месца па гадавым росце ВУП заняла Швецыя — 6,5%. Эканоміка Польшчы за год вырасла на 4,3%, Латвіі — на 3,1%.

### БАНАНЫ І 30-ХВІЛІННЫЯ ШПАЦЫРЫ АДРЭГУЛЮЮЦЬ ЦІСК БЕЗ ТАБЛЕТАК

**Калі ў вас праблемы з ціскам, не варта адразу хапацца за лекі. Медыкі раяць спачатку прыняць да ўвагі некалькі правілаў харчавання, піша The Times of India. Напрыклад, варта абмежаваць спажыванне солі. Паводле дырэктывы амерыканскіх экспертаў, людзям, якія маюць праблемы з ціскам, лепш зменшаць аб'ём солі — спажываць менш чым 1500 міліграмаў у дзень.**

Ад скокаў ціску выратуюць рэгулярныя трэніроўкі. Пры гэтым досыць умераных нагрузак на працягу 30 хвілін штодня. Можна пайсці на шпацыр, пакатацца на веласіпедзе, паплаваць ці схадзіць на аэробіку. Галоўнае — не парушаць рэжым. Вядома, калі ў чалавека ёсць залішняя вага, неабходна яе скінуць.

Вельмі спатрэбяцца бананы. Паводле даследаванняў, яны дапамагаюць палепшыць паказчыкі ціску. Справа ў тым, што бананы багатыя на калій, які станоўча ўплывае на стан здароўя. Так, людзі, якія пакутуюць ад моцнай гіпертаніі, могуць палепшыць якасць жыцця, уключыўшы калій у свой рацыён (норма для сталага чалавека — 4700 міліграмаў калію ў дзень). А вось ад алкаголю нагул лепш адмовіцца.



# СТАЛІЧНАЯ АРЭНДА Ў ДОЛАРАХ ПАТАННЕЛА,

## а разлікі ажыццяўляюцца выключна ў рублях

**У той час, калі на сталічным другасным рынку жыллёвай нерухомасці пачаўся мёртвы сезон, бо кватэры ўжо амаль ніхто не купляе, на рынку арэнды пачалося масавае перасяленне кватарантаў. Тут сітуацыя складваецца даволі напружаная, бо адбылося сутыкненне інтарэсаў гаспадароў жылля і іх патэнцыйных кліентаў.**

### У першую чаргу патаннелі вельмі слабыя кватэры

Сёння **самыя слабенькія** па якасці аднапакаёвыя **кватэры** (маюцца на ўвазе «хрушчоўкі» ў старых пяціпавярховых дамах) без мэблі ці з мэбляй яшчэ савецкіх часоў **можна адшукаць за 160—170 долараў**. Такія кватэры за месяц-два патаннелі ў доларавым эквіваленце прыкладна на 40—50 USD. Зараз цалкам пустыя кватэры ў новых дамах свежых сталічных мікрараёнаў прапануюцца кліентам ужо за 170—180 долараў.

Паводле інфармацыі **агента па аперацыях з жыллёвай нерухомасцю агенцтва нерухомасці «Дзінас» Іны КУЛЬШЫ**, сярэдні кошт арэнды аднапакаёвых кватэр са стандартнай мэбляй і рамонтам прымальнай якасці складае 200—220 долараў. Крок патаннення такіх кватэр склаў усяго 20—30 долараў. Сапраўды якасныя аднапакаёўкі з сучаснай мэбляй, камплектам бытавой тэхнікі (абавязкова пральная машына) каштуюць 250—280 долараў. Яшчэ ў пачатку вясны падобныя кватэры каштавалі не менш за 300—350 долараў. Наш эксперт адзначае, што больш за ўсё таннеюць менавіта маленькія «хрушчоўкі» ў старых дамах у не вельмі «прыгожых» мікрараёнах. Часам зніжкі па такім жыллі дасягаюць і 60—70 долараў. Сапраўды якаснае жыллё побач з метро ці ў іншых цікавых раёнах патаннела мінімальна — не больш чым на 20—40 долараў.

### З'явіліся танныя двухпакаёўкі

Валютны «голад» у краіне моцна зачапіў цэннікі і двухпакаёвых кватэр. Сёння мінімальны кошт слабенькіх «двушак» практычна без мэблі складае 230—250 амерыканскіх долараў. Больш за тое, зусім дрэнныя «хрушчоўкі» ў Шабанах і Заводскім раёне, з планіроўкай «а-ля прахадныя пакойчыкі», могуць каштаваць 200—220 долараў.

Разам з тым, двухпакаёвыя кватэры сярэдняй якасці і не вельмі далёка ад метро прапануюцца ўжо за 250—270 долараў. Прасторныя двухпакаёўкі пасля добрага рамонту каштуюць цяпер недзе 350—400 долараў. Яшчэ два месяцы таму такія кватэрныя «лялькі» мелі рэальны рынкавы кошт прыкладна на 70—100 долараў даражэй.

Самыя танныя **трохпакаёвыя «хрушчоўкі»** з прахаднымі пакоямі ў старых дамах можна адшукаць за 250—270 долараў. Крыху лепшыя па якасці, але маленькія па плошчы трохпакаёвыя кватэры прапануюцца кліентам за 300—320, а сярэдні кошт стандартных трохпакаёвак у спальных мікрараёнах складае 330—400 долараў. З добрым рамонтам такія кватэры ў прэстыжных раёнах каштуюць да 450 долараў.

### Пачалося масавае перасяленне

Спадарыня Кульша адзначае тэндэнцыю на рынку арэнды, калі прапанова пачынае перавышаць попыт на здымнае жыллё. Чаму гэта адбываецца? У першую чаргу гэта датычыцца пенсіянераў, якія часова з'ехалі жыць на дачу, а сваё жыллё здаюць на цёплы сезон — 3—6 месяцаў. Праўда, гэтыя гаспадары жылля пры здачы кватэр не заўсёды раскрываюць «усе карты» кватарантам аб рэальным тэрміне арэнды. Першапачаткова кватэра здаецца быццам бы мінімум на год, а ў выніку бліжэй да зімы сітуацыя рэзка мяняецца і кватаранту неабходна шукаць ужо іншае жыллё. Вядома, што такія сезонныя кватэры крыху танней, чым на рынку, таму яны і карыстаюцца попытам.

Да апошняга часу ўладальнікі кватэр атрымлівалі арэнду ў доларах па фіксаваных стаўках. Цяпер кватаранты патрабуюць істотна знізіць доларавы цэннік арэнды і згодны плаціць толькі ў рублях. Гаспадары кватэр на такія зніжкі згаджаюцца вельмі неахвотна. Таму бескватэрныя сем'і пачалі актыўна шукаць танныя кватэры ў мікрараёнах Малінаўка, Дружба, Шабаны і Заводскім раёне. Той, хто раней здымаў прасторную двухпакаёвую кватэру побач з метро, зараз ужо шукае сабе таннейшую аднапакаёўку. Сёння многія маладыя сем'і адмаўляюцца ад здымных кватэр і вяртаюцца ў кватэры бацькоў.

### Студэнцкі ажыятаж арэнду не падыме

Наш эксперт Іна Кульша ўпэўнена, што на працягу чэрвеня існуючы кошт арэнды жылля застанецца на цяперашнім узроўні ці нават крыху знізіцца, але не больш чым на 10 долараў. Потым, у ліпені—жніўні, Мінск чакае традыцыйны сезон студэнцкага ажыятажу, калі попыт на здымнае жыллё рэзка павялічыцца. Аднак нават тады цэннікі на кватэры ў доларавым эквіваленце павялічвацца не будуць. Яны могуць павялічыцца толькі ў другой дэкадзе жніўня на самыя ліквідныя кватэры побач з метро ў Цэнтральным раёне Мінска. Такі невялікі ўсплёск могуць выклікаць студэнты з добрымі грашыма (доларамі). У большасці сваёй бацькі студэнтаў атрымліваюць заробкі ў беларускіх рублях, таму і тады не будзе нейкіх сур'ёзных перадумоў для павелічэння існуючых цэннікаў арэнды жылля.

Самым істотным фактам на рынку арэнды гэтым летам будзе тое, што гаспадары жылля будуць вымушаны прымаць плату за кватэры толькі ў нацыянальнай валюце. Сёння запасы валюты ў насельніцтва ёсць, аднак разлічвацца ёю будуць толькі ў самых выключных выпадках, лічыць Іна Кульша.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Здарэнні

### СВАВОЛІЛІ ДЗЕЦІ З АГНЁМ — АТРЫМАЛІ АПЁКІ

**У Мінску насупраць дома № 8 па вуліцы Каленікава каля 22 гадзін трое хлапчукоў гулялі на вуліцы. Відавочна, знайшлі пяцілітровую ёмістасць з невядомай вадкасцю...**

Пры падпальванні на дваровай тэрыторыі гэтай вадкасці з 5-літровай пластыкавай бутэлькі адбылося яе ўзгаранне. У выніку трое хлапчукоў атрымалі сур'ёзныя апёкі. Найбольш пацярпеў Мікіта, 2003 года нараджэння, вучань сталічнай сярэдняй школы №49: у бальніцу ён быў дастаўлены з дыягназам «апёкавая хвароба ў стадыі шоку, тэрмаінгаляцыйная траўма, тэрмічныя апёкі полымем галавы, тулава, верхніх і ніжніх канечнасцяў 1-3 ступені (50 працэнтаў)». Вучань той жа школы Аляксандр, 2002 года нараджэння, быў шпіталізаваны з некалькі меншымі наступствамі: апёкамі 1-3 ступені (15 працэнтаў). Самы старэйшы — Вадзім, 1997 года нараджэння, вучань сталічнай сярэдняй школы №126 — быў дастаўлены ў бальніцу з апёкамі 1-3 ступені (30 працэнтаў).

